Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыка-культурнай спадчыны

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
____________ Д.В. Герасімёнак
«23» ____09____ 2025 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
____________ Ю.М. Галкоўская
«23» ____09____ 2025 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ТЭОРЫЯ ТУРЫЗМУ

для спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

Складальнік: Лупашка І.Г., дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны, кандыдат культуралогіі, дацэнт

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Савета факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый

«23» ____09____2025 г., пратакол № 1

Рэцэнзенты:

*Навукова-метадычны савет установы “Музей “Замкавы комплекс “Мір”;*

*С.А. Пацыенка, дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці, кандыдат культуралогіі*

Разгледжана і абмеркавана на пасяджэнні кафедры гісторыка-культурнай спадчыны
(пратакол ад 29.08.2025 № 1)

ЗМЕСТ

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 7
2.1 План-канспект лекцый 7
3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 12
3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў 12
4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 15
4.1 Заданні да самастойнай работы студэнтаў 15
4.2 Пытанні да экзамена 15
4.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вуэбнай дзейнасці студэнтаў 16
5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 20
5.1 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны 20
5.2 Асноўная літаратура 21
5.3 Дадатковая літаратура 21

# 1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна–метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне “Тэорыя турызму” для студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0322-03 “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны” распрацаваны на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі першай ступені АСВА 6-05-0322-03-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Рэгістрацыйны нумар 6-05-03-29/23 вуч.ад 15.02.2023 г.

Актуальнасць вучэбнай дысцыпліны вызначаецца яе роляй у працэсе падрыхтоўкі супрацоўнікаў музейных і турыстычных устаноў. Вывучэнне спецыфікі развіцця нацыянальнага і міжнароднага турызму немагчыма без азнаямлення з тэарэтычнымі асновамі турыстычнай дзейнасці.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Тэорыя турызму” спрыяе фарміраванню ўсебакова развітага спецыяліста ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Змест дысцыпліны раскрывае асноўныя кірункі сучаснай турыстычнай дзейнасці, асаблівасці і перспектывы развіцця Беларусі на міжнародным турыстычным рынку.

*Мэтай вучэбнай дысцыпліны* з’яўляецца засваенне студэнтамі тэарэтычных асноў нацыянальнага і міжнароднага турызму, а таксама выкарыстанне атрыманных ведаў у галіне турыстычнай дзейнасці.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– даць студэнтам тэарэтычныя асновы турыстычнай дзейнасці;

– раскрыць паняційна-катэгарыяльны, тэрміналагічны апарат турыстычнай сферы;

– выпрацаваць у студэнтаў уменні пошуку і апрацоўкі неабходнай інфармацыі, рабоце з літаратурай і крыніцамі.

Зместам вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадыны” прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый:

– выкарыстоўваць сучасныя веды аб культуры і тэндэнцыях яе развіцця ў музейнай, турыстычнай і менеджэрскай дзейнасці, ахове культурнай спадчыны, навыкі педагагічнага і аратарскага майстэрства ў яе інтэрпрэтацыі.

У выніку засваення дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

– змест асноўных паняццяў у галіне турызма і іх суадносіны;

– асноўныя тэндэнцыі развіцця турызму ў краіне і свеце;

– перспектыўныя віды турыстычнай дзейнасці ў Беларусі;
– навуковыя даследаванні айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне.

Студэнты павінны ў*мець:*

– карыстацца базавай тэрміналогіяй у турыстычнай сферы;
– выкарыстоўваць базавыя веды пры правядзенні практычнай і навуковай работы;
– аналізаваць атрыманую інфармацыю з навукова-метадычнай літаратуры і крыніц;
– выкарыстоўваць найноўшыя навуковыя даследаванні айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне пры распрацоўцы і арганізацыі гісторыка-культурных маршрутаў.

Студэнты павінны *валодаць*:

– навыкамі сістэматызацыі атрыманых ведаў;
– навыкамі стварэння інфармацыйных прадуктаў розных відаў па тэме курса.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне “Тэорыя турызму” распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена з праграмамі вучэбных “Гісторыя і арганізацыя турызму”, “Геаграфія турызму”, “Менеджмент і маркетынг турызму”, “Турыстычны патэнцыял Беларусі”, а таксама такімі дыцыплінамі, як “Гісторыя архітэктуры”, “Тэорыя і практыка экскурсійнай работы” і інш.

У ходзе адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць асабісты каштоўнасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, які гатовы да актыўнага ўдзелу ў сацыяльна-культурным жыцці краіны.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны “Тэорыя турызму” выкарыстоўваюцца сучасныя метады навучання і камп’ютэрныя тэхналогіі.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкарыстоўваюцца рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў укараняюцца методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Асноўнымі формамі навучання па вучэбнай дысцыпліне з’яўляюцца лекцыі і семінарскія заняткі, заданні для самастойнай работы студэнтаў.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на развіццё самастойных даследчых навыкаў, пошук неабходнай інфармацыі ў навукова-метадычнай літаратуры, інтэрнэт-крыніцах. Выкарыстоўваючы кантэнт-аналіз крыніц, прысвечаных актуальным праблемам турыстычнай дзейнасці, кожны студэнт падрыхтоўвае адпаведныя рэфераты і індывідуальныя даследчыя работы, прапаноўваюцца творчыя заданні, сумесная работа ў малых групах.

У адпаведнасці з вучэбным планам на выкладанне дысцыпліны “Тэорыя турызму” ўсяго прадугледжана 110 гадзін, з якіх 54 – аўдыторныя. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 36 гадзін, семінарскія – 18 гадзін. Форма правядзення бягучай атэстацыі – вуснае апытанне. Рэкамендаваная форма прамежкавай атэстацыі – экзамен.

# 2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 План-канспект лекцый

Тэма 1 Уводзіны. Прадмет і змест курса

Метадалагічныя асновы і прынцыпы вывучэння тэорыі турыстычнай дзейнасці. Прадмет, задачы, структура і змест курса.

Сувязь курса з іншымі дысцыплінамі.

Вучэбна-метадычнае забеспячэнне. Агульная характарыстыка крыніц і літаратуры.

Тэма 2 Асноўныя паняцці. Класіфікацыя турызму

Асноўныя паняцці: турызм, тур, турыстычная дзейнасць, турыстычныя паслугі, тураператар, турагент, турыст, экскурсант і інш.

Класіфікацыя турызму па тыпах, відах і формах.

Класіфікацыя турызма зыходзячы з характара фінансавання.

Унутраны, уязны і выяздны турызм. Паняцце “міжнароднага”, “нацыянальнага” турызму.

Функцыянальная класіфікацыя турызму. Традыцыйныя і спецыяльныя віды турызму.

Сучасныя тэндэнцыі развіцця турызму.

Тэма 3 Культурныя і сацыяльныя аспекты турызму

Турызм як з’ява грамадскага жыцця.

Уплыў сацыядэмаграфічных змен на развіццё турызму. Старэнне насельніцтва. Павышэнне сямейнага даходу.

Знешнія фактары, якія вызначаюць турыстычную актыўнасць. Геаграфічнае месцапалажэнне, наяўнасць турыстычных аб’ектаў, бяспечнасць для турыстаў, развіццё інфраструктуры і г.д.

Эканамічныя і палітычныя фактары развіцця турызму.

Пазітыўныя і негатыўныя аспекты развіцця турызму.

Турызм і іншыя галіны ведаў.

Тэма 4 Матывацыя ў турызме. Тыпалогія турыстаў

Матывацыйныя аспекты ў турызме. Аб’ектыўныя і суб’ектыўныя прычыны і матывы падарожжаў. Асноўныя патрабаванні турыста да тура.

Віды турыстаў. Арганізаваны масавы турыст, індывідуальны турыст, турыст-даследчык, турыст-вандроўнік. Катэгорыі турыстаў. Класіфікацыя тыпаў турыстаў Г. Гана. Класіфікацыя ў залежнасці ад стылю жыцця і

запатрэбаванняў турыстаў. Катэгорыі вандроўнікаў, якія не адносяцца да катэгорыі турыстаў.

Тэма 5 Спецыфіка і склад турыстычнай індустрыі

Суб'ект і аб'ект турызму.

Турыстычная зона.

Турыстычныя прадпрыемствы і арганізацыі. Дзейнасць тураператараў і турыстычных агенцтваў. Буйнейшыя турыстычныя агенцтвы і кампаніі Беларусі. Паслугі ў размяшчэнні, харчаванні і перамяшчэнні турыстаў. Асноўныя, спецыяльныя і дадатковыя патрэбы турыстаў падчас падарожжа.

Тэма 6 Экалагічны турызм. Аграэкатурызм

Перадумовы зараджэння экалагічнага турызму. Уздзеянне турызму на прыродныя рэсурсы.

Віды экалагічнага турызму.

Буйнейшыя нацыянальныя паркі, запаведнікі і заказнікі ў свеце і Беларусі. Прыродная спадчына ЮНЕСКА.

Перспектывы развіцця экалагічнага турызму ў Беларусі. Умовы размяшчэння: гатэлі, матэлі, эка-гатэлі, пансіянаты, курорты, кэмпінгі.

Развіццё і перспектывы аграэкатурызму.

Тэма 7 Гісторыка-культурны турызм. Круізны турызм

Характарыстыка гісторыка-культурнага турызму. Суадносіны паняццяў "гісторыка-культруны", "культурны", "культурна-пазнавальны", "экскурсійны" турызм.

Асноўныя рэгіёны развіцця культурна-пазнавальнага турызму ў свеце. Стацыянарныя і маршрутазаваныя туры. Самастойна арганізаваныя турыстычныя паездкі.

Гісторыка-культурныя аб'екты, унесеныя ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Гісторыка-культурныя аб'екты Беларусі.

Гісторыка-культурныя маршруты, прапаноўваемыя беларускімі турыстычнымі кампаніямі. Перспектывы развіцця гісторыка-культурнага турызму ў Беларусі.

Паняцце круізнага турызму. Віды караблёў, лайнераў, яхт і іх выкарыстанне ў турызме. Марскія і рачныя круізы.

Найбольш папулярныя рэгіёны для развіцця круізнага турызму. Асаблівасці размяшчэння і прадастаўлення паслуг у круізным турызме.

Рачныя круізы па Беларусі.

Тэма 8 Падзейны турызм

Вызначэнне падзейнага турызму.

Асаблівасці абслугоўвання турыстаў-удзельнікаў міжнародных і нацыянальных падзей. Сэрвіс і гасціннасць пры абслугоўванні вялікіх груп турыстаў.

Міжнародныя і нацыянальныя культурныя фестывалі, спаборніцтвы, канцэрты, святы і г.д.

Буйнейшыя тэатралізаваныя шоу (шэсці і карнавалы). Фестывалі кіно і тэатра.

Гастранамічныя фестывалі.

Фестывалі музыкі і музычныя конкурсы.

Спартыўныя падзеі.

Перспектывы падзейнага турызму ў Беларусі.

Тэма 9 Рэлігійны турызм

Вызначэнне і разнавіднасці рэлігійнага турызму.

Паломніцкі турызм. Віды і асаблівасці паломніцтва.

Рэлігійны турызм экскурсійна-пазнавальнай накіраванасці.

Вызначэнне паняццяў “культавы цэнтр” і “рэлігійны цэнтр”.

Тыпалогія сучасных рэлігій і іх цэнтраў. Сусветныя рэгіёны і месцы для паломнікаў.

Папулярныя месцы і аб’екты для развіцця рэлігійнага і паломніцкага турызму ў Беларусі.

Асаблівасці турыстычнай дзейнасці пры абслугоўванні рэлігійных турыстаў і паломнікаў.

Тэма 10 Дзелавы турызм

Паняцце дзелавога турызму Геаграфія бізнес-паездак. Дзелавыя паездкі ў Еўропе і свеце.

Віды дзелавога турызму (MICE: Meetings (сустрэчы), Incentives (заахвочвальныя паездкі), Conferences (канферэнцыі), Exhibitions (выставы)). Кангрэсна-выставачны турызм. Арганізацыя групавых бізнес-паездак. Інтэнсіў-турызм. Дыпламатычны турызм.

Умовы развіцця дзелавога турызму. Патрабаванні да размяшчэння і харчавання бізнес-турыстаў. Гатэлі – бізнес-цэнтры.

Тэма 11 Лячэбна-аздараўленчы турызм. Медыцынскі турызм

Курорталогія як навука. Зараджэнне і развіццё курортаў. Санаторна-курортныя цэнтры. Патрабаванні, прад’яўляемыя да курортаў.

Курорты і іх тыпалогія. Бальнеалагічныя, бальнеакліматычныя, бальнеагразевыя, гразевыя, кліматакумысалячэбныя, кліматычныя курорты (прыморскія кліматычныя і горныя кліматычныя курорты).

Асноўныя рэгіёны размяшчэння курортаў у Еўропе. Spa-курорты. Марскія курорты. Папулярныя марскія курорты ў свеце.

Перспектывы развіцця санаторных курортаў, здраўніц Беларусі. Індустрыя гасціннасці і сэрвісу ў курортных зонах. Дадатковыя паслугі і сэрвіс на курортах.

Медыцынскі турызм і асаблівасці яго арганізацыі.

Тэма 12 Экстрэмальны, гарналыжны і спартыўны турызм

Рост цікавасці да незвычайных відаў турызму. Паняцце аб экстрэмальным турызме. Водныя, наземныя, горныя, паветраныя віды экстрэмальнага турызму.

Гарналыжны турызм. Папулярныя сусветныя гарналыжныя курорты. Асаблівасці размяшчэння турыстаў і прадастаўленне паслуг на гарналыжных курортах. Асаблівасці клімату, неабходнага для арганізацыі гарналыжнага курорта. Гарналыжны курорт як цэнтр развіцця спартыўнага і экстрымальнага турызму.

Галоўныя спартыўныя падзеі і спартыўны турызм. Актыўны і пасіўны спартыўны турызм. Буйнейшыя спартыўныя спаборніцтвы. Сэрвіс і гасціннасць пры абслугоўванні спартыўных турыстаў.

Экзатычныя віды экстрэмальнага турызму. Турызм катастроф, джайла-турызм, пурызм і інш.

Тэма 13 Прамысловы турызм

Вызначэнне паняцця “прамысловы турызм”.

Класіфікацыя прамысловага турызму.

Беларускі і замежны вопыт развіцця прамысловага турызму.

Узаемадзеянне прамысловых прадпрыемстваў з суб’ектамі турыстычнай дзейнасці.

Аб’екты прамысловага турызму ў Рэспубліцы Беларусь.

Асаблівасці арганізацыі і правядзення прамысловых тураў.

Тэма 14 Міжнародныя турыстычныя арганізацыі

Класіфікацыя турыстычных арганізацый. Прыкметы турыстычных арганізацый. Сусветныя турыстычныя арганізацыі і напрамкі іх дзейнасці.

Сусветная турыстычная арганізацыя (ЮНВТО) і яе роля ў статыстыцы і вывучэнні развіцця міжнароднага турызму.

Міжнародная асацыяцыя паветранага транспарту. Карпарацыя пасажырскіх паслуг. Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця.

Нацыянальныя і рэгіянальныя арганізацыі.

Нацыянальнае агенцтва па турызму Беларусі. Узаемадзеянне беларускіх турыстычных арганізацый з арганізацыямі свету.

Тэма 15 Інавацыі ў турыстычнай індустрыі

Паняцце аб інавацыях і іх роля ў турыстычнай дзейнасці.

Інавацыі ў транспартным забеспячэнні.

Інавацыі ў гасцінічным бізнесе і сферы абслугоўвання.

Інфармацыйныя тэхналогіі і іх роляў развіцці турыстычнай дзейнасці. Сістэмы інтэрнэт-браніравання і іх выкарыстанне ў турызме.

Турыстычны прадукт як інавацыя.

Тэма 16 Турыстычная індустрыя Беларусі

Турыстычная індустрыя Беларусі і яе роля ў развіцці міжнароднага турызму. Буйнейшыя тураператары і турыстычныя агенцтвы Беларусі. Супрацоўніцтва з міжнароднымі турыстычнымі кампаніямі.

Перспектыўныя напрамкі развіцця турызму ў Беларусі. Транспартнае забеспячэнне, гатэльны бізнес, экскурсійныя паслугі і інш. Перспектывы развіцця рэгіянальнага турызму.

# 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў

Семінарскія заняткі разлічаны на набыццё практычных ведаў па адпаведнаму курсу.

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай, рабіць неабходныя нататкі, імкнуцца да сварэння пэўных абагульненняў на падставе набытага фактычнага матэрыялу.

Форма выканання работы – напісанне рэферату, выкананне пісьмовых заданняў па асобных раздзелах дысцыпліны, вусны адказ у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, удзел у калоквіуме, стварэнне электронных прэзентацый, групавыя і індывідуальныя праекты, творчыя заданні ў ходзе самастойнай кіруемай работы студэнтаў і інш.

### Семінарскія заняткі 1
### Асноўныя паняцці. Класіфікацыя турызму
### Спецыфіка і склад турыстычнай індустрыі

1. Асноўныя паняцці.
2. Класіфікацыя турызму.
3. Структура турызму. Фактары развіцця турызму.
4. Сучасныя тэндэнцыі развіцця турызму.
5. Суб’ект і аб’ект турызму.
6. Турыстычны рэгіён і турыстычная дэстынацыя.
7. Турыстычныя прадпрыемствы. Дзейнасць тураператараў і турыстычных агенцтваў.
8. Буйнейшыя тураператары і турагенцтвы на турыстычным рынку Беларусі.
9. Паслугі ў размяшчэнні, харчаванні і перамяшчэнні турыстаў.
10. Асноўныя, спецыяльныя і дадатковыя патрэбы турыстаў падчас падарожжа. Спосабы іх забеспячэння.

Літаратура:

1. Биржаков, М.Б. Введение в туризм / М.Б. Биржаков. - М., СПб.: Невский Фонд: Герда, 2007. - 576 с.
2. Зорин, И. В. Энциклопедия туризма / И.В.Зорин, В.А.Квартальнов. - М.: Финансы и статистика, 2004. - 364 с.
3. Квартальнов, В.А. Теория и практика туризма: Учеб. для вузов турист. профиля / В.А.Квартальнов. - М.: Финансы и статистика, 2003. - 670 с.

4. Кусков, А.С., Джаладян Ю.А. Основы туризма / А. С. Кусков, Ю.А. Джаладян. - Москва: КноРус, 2008. - 387 с.

5. Туризм в Беларуси / Л.М.Гайдукевич, А.И.Тарасенок, Д.Г.Решетников, Н.И.Полещук; Бел. гос. ун-т, Фак. междунар. отношений, Каф. междунар. туризма. – Мінск : БГУ, 2001. – 131 с.

6. Туристская энциклопедия Беларуси / З.Я. Андриевская и др.– Минск: Беларус. Энцык., 2007. – 647 с.

7. Туристские регионы Беларуси / З.Я. Андриевская и др.–Минск: Беларус. Энцык., 2008. – 600 с.

## Семінарскія заняткі 2

## Экалагічны турызм. Аэграэкатурызм

Семінарскія заняткі прадугледжваюць падрыхтоўку студэнтамі і абмеркаванне ў групе мультымедыйных прэзентацый. На аснове інтэрнэт-крыніц студэнтам прапаноўваецца прадставіць канкрэтныя праекты, рэалізаваныя ў Беларусі ў сферы экалагічнага і аграэкатурызму.

Альтэрнатыўны варыянт – распацоўка і прадстаўленне новых маршрутаў у сферы экалагічнага турызму.

## Семінарскія заняткі 3, 4

## Гісторыка-культурны турызм. Круізны турызм

Семінарскія заняткі прадугледжваюць падрыхтоўку студэнтамі і абмеркаванне ў групе мультымедыйных прэзентацый. На аснове інтэрнэт-крыніц студэнтам прапаноўваецца прадставіць канкрэтныя праекты, рэалізаваныя ў сферы гісторыка-культурнага і круізнага турызму.

Альтэрнатыўны варыянт – распацоўка і прадстаўленне 2-3-дзённай гісторыка-культурнай праграмы для розных катэгорый турыстаў.

Па магчымасці, адзін з заняткаў праходзіць у выглядзе пешаходнай экскурсіі па г. Мінску з атэставаным экскурсаводам.

## Семінарскія заняткі 5

## Падзейны турызм

Семінарскія заняткі прадугледжваюць падрыхтоўку студэнтамі і абмеркаванне ў групе мультымедыйных прэзентацый. На аснове інтэрнэт-крыніц студэнтам прапаноўваецца прадставіць канкрэтныя праекты ў сферы падзейнага турызма, рэалізуемыя ў свеце і Беларусі.

Альтэрнатыўны варыянт – складанне календара падзей нацыянальнага, рэгіянальнага і лакальнага ўзроўню на наступны календарны год, адбор і прадстаўленне 1-2 падзей у ракукрсе развіцця падзейнага турызму.

Семінарскія заняткі 6

Экстрэмальны, гарналыжны і спартыўны турызм

Семінарскія заняткі прадугледжваюць падрыхтоўку студэнтамі і абмеркаванне ў групе мультымедыйных прэзентацый. На аснове інтэрнэт-крыніц студэнтам прапаноўваецца прадставіць канкрэтныя праекты па азначаных відах турызму.

Семінарскія заняткі 7

Інавацыі ў турыстычнай індустрыі. Турыстычная індустрыя Беларусі

1. Паняцце аб інавацыях і іх ролі ў турыстычнай дзейнасці.
2. Інавацыі ў транспартным забеспячэнні. Інавацыі ў гасцінічным бізнесе і сферы абслугоўвання.
3. Інфармацыйныя тэхналогіі і іх роляў развіцці турыстычнай дзейнасці. Сістэмы інтэрнэт-браніравання і іх выкарыстанне ў турызме.
4. Турыстычны прадукт як інавацыя.
5. Турыстычная індустрыя Беларусі: сучасны стан.
6. Перспектыўныя напрамкі развіцця турызму ў Беларусі.

Літаратура:

1. Зорин, И. В. Энциклопедия туризма / И.В.Зорин, В.А.Квартальнов. - М.: Финансы и статистика, 2004. - 364 с.
2. Кусков, А.С. Основы туризма / А.С. Кусков, Ю.А. Джаладян. – Москва:КноРус, 2008. – 387с.
3. Туризм в Беларуси / Л.М.Гайдукевич, А.И.Тарасенок, Д.Г.Решетников, Н.И.Полещук; Бел. гос. ун-т, Фак. междунар. отношений, Каф. междунар. туризма. – Мінск : БГУ, 2001. – 131 с.

# 4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

## 4.1 Заданні да самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў адносна пытанняў сучасных тэндэнцый развіцця турыстычнай дзейнасці.

Форма выканання работы – напісанне рэфератаў, вусны адказ у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, падрыхтоўка прэзентацый, удзел у калоквіуме (па выбару).

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай, так і дадатковай літаратурай.

Прапануемыя тэмы:

1. Культурныя і сацыяльныя аспекты турызму.
2. Матывацыя ў турызме.
3. Тыпалогія турыстаў.
4. Рэлігійны турызм.
5. Дзелавы турызм.
6. Лячэбна-аздараўленчы турызм.
7. Медыцынскі турызм.
8. Адукацыйны турызм.
9. Паляўнічы турызм.
10. Прамысловы турызм.
11. Міжнародныя турыстычныя арганізацыі.

## 4.2 Пытанні да экзамена

1. Базавыя паняцці ў турызме.
2. Асаблівасці турызму як аб’екта сацыяльных паслуг.
3. Віды турызму і іх характарыстыка.
4. Асноўныя заканадаўчыя дакументы ў турыстычнай дзейнасці.
5. Сутнасць паняцця “турызм”. Міжнародны турызм.
6. Турызм і іншыя галіны ведаў.
7. Сучасны стан і тэндэнцыі міжнароднага турызму.
8. Перспектывы развіцця міжнароднага турызму. Геаграфічныя фактары развіцця турызму.
9. Турыстычная індустрыя як сацыяльная з’ява.
10. Структура турызму. Фактары развіцця турызму.
11. Палітычныя, сацыяльныя фактары развіцця турызму.
12. Эканамічныя фактары развіцця турызму.
13. Станоўчыя і адмоўныя аспекты турыстычнай дзейнасці.
14. Тыпалогія турыстаў. Фактары і матывацыя падарожжаў.

15. Асноўныя, дадатковыя і спецыяльныя запатрабаванні турыстаў.
16. Асаблівасці абслугоўвання і арганізацыі тура для розных катэгорый турыстаў.
17. Турыстычны прадукт. Этапы яго стварэння і рэалізацыі.
18. Матывацыя для выбару турыстычнага прадукта.
19. Асноўныя фактары турыстычнай матывацыі.
20. Клімата-геаграфічныя асаблівасці размеркавання турызму.
21. Спецыяльныя віды турызму. Новыя кірункі ў турызме.
22. Дзелавы і кангрэсны турызм.
23. Рэлігійны і паломніцкі турызм. Асноўная характарыстыка.
24. Экалагічны турызм і ўмовы яго развіцця.
25. Лячэбна-аздараўленчы турызм, асаблівасці яго развіцця на сучасным этапе.
26. Падзейны турызм. Асноўныя падзеі сусветнага і нацыянальнага маштаба.
27. Эстрэмальны турызм як папулярная форма адпачынку.
28. Гісторыка-культурны турызм. Асноўныя катэгорыі аб’ектаў паказу.
29. Круізны і горналыжны турызм. Асаблівасці і ўмовы сучаснага развіцця.
30. Спартыўны турызм. Асноўныя кірункі і фактары развіцця.
31. Адукацыйны турызм. Кірункі і асаблівасці.
32. Экзатычныя віды турызму.
33. Рэкрэацыйны і псіхалагічны турызм.
34. Міжнародныя турыстычныя арганізацыі.
35. Інавацыйная дзейнасць у транспартнай індустрыі.
36. Інавацыйная дзейнасць у гатэльным бізнэсе.
37. Інавацыйная дзейнасць у інфармацыйных тэхналогіях турызму.
38. Прамысловы турызм.
39. Перспектыўныя кірункі турызму ў Беларусі.
40. Турыстычны патэнцыял Беларусі.

4.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

| | |
|---|---|
| 1 (адзін) | адзнака ставіцца, калі студэнт адмовіўся ад адказу ці спроба адказу цалкам не адпавядае зместу прапанаваных студэнту пытанняў або студэнт зусім не валодаем вучэбным матэрыялам. |
| 2 (два) | адзнака ставіцца студэнту, які мае істотныя прабелы ў ведах, не арыентуецца ў спецыялізаваных тэрмінах і |

| | |
|---|---|
| | паняццях, не валодае асноўнымі паняццямі турыстычнай сферы, не ведае класіфікацыі турызму, не засвоіў большую частку праграмнага матэрыялу, а таксама у выпадку пропускаў і неадпрацоўцы семінарскіх заняткаў, не выкананні заданняў па самастойнай рабоце. |
| 3 (тры) | адзнака ставіцца студэнту, які ведае частку вучэбнага матэрыялу, вельмі слаба аруентуецца ў асноўных турыстычных паняццях, не ведае віды турызму і іх асаблівасці, не вызначыўся актыўнасцю і зацікаўленасцю курсам на семінарскіх занятках, а таксама пры выкананні самастойных і кантрольных работ, няпоўнасцю адпрацаваў практычныя заняткі. |
| 4 (чатыры) | адзнака ставіцца студэнту, які не глыбока валодае асноўным вучэбным матэрыялам, слаба арыентуецца ў асноўных паняццях у турыстычнай галіне, не добра ведае або блытаецца у відах турызму і слаба разумее асноўныя аспекты развіцця турызму ў розных рэгіёнах свету, а таксама не праяўляў актыўнасць на семінарскіх занятках, але атрымаў станоўчую адзнаку за выкананне заданняў па курсе. |
| 5 (пяць) | заслугоўвае студэнт, які ў асноўным засвоіў вучэбны матэрыял па праграме, самастойна выконваў заданні, але дапусціў пры іх выкананні памылкі, не вельмі добра валодае праграмным матэрыялам, дапускае не дасканаласці пры выкарыстанні асноўных паняццяў турыстычнай ідустрыі, не добра разбіраецца відах і формах турызму, пры адказе дапускае грубыя памылкі і непоўна раскрывае пытанні, на семінарскіх занятках не праявіў значнай актыўнасці. |
| 6 (шэсць) | заслугоўвае студэнт, які дастаткова ведае вучэбны матэрыял па праграме, завоіў праграмны матэрыял, пры адказе карыстаецца асноўнымі паняццямі і тэрмінамі, ведае класіфікацыю турызму і асаблівасці функцыянавання розных відаў турызму, таксама прымаў удзел у семнарскіх занятках, выканаў неабходныя заданні, атрымаўшы станоўчыя адзнакі, але пры адказе на пытанні дапускае недасканаласці і неістотныя памылкі. |

| | |
|---|---|
| 7 (сем) | заслугоўвае студэнт, які трывала і грунтоўна ведае вучэбны матэрыял па праграме, карыстаецца прафесійнай лексікай, добра разбіраеца ў розных аспектах развіцця турызму, валодае ведамі аб фактарах, матывацыі, паслугах у турыстычнай індустрыі, выкарыстоўвае свае веды пад час актыўнага удзелу на семінарскіх занятках, а таксама своечасова выканаў усе заданні і атрымаў добрыя адзнакі, аднак у адказе дапусціў нязначныя памылкі. |
| 8 (восем) | заслугоўвае студэнт, які паказаў веданне вучэбнага матэрыялу па праграме, на пытанні адказвае добра з валоданнем тэрміналогіі і сутнасці пытання, добра разбіраецца ў разнастайных формах і відах турызму, ведае асаблівасці развіцця нацыянальнага турызму, апеліруе фактамі і дадатковай інфармацыяй ў турыстычнай галіне, а таксама пры падрыхтоўцы да заняткаў карыстаўся асноўнай літаратурай, рэкамендаванай у праграме, самастойна і своечасова выканаў усе заданні, праявіў актыўнасць на семінарскіх занятках. |
| 9 (дзевяць) | заслугоўвае студэнт, які поўна і сістэмна засвоіў вучэбны матэрыял па праграме, пры адказе дэманструе грунтоўныя веды і веданне матэрыялу, выкарыстоўваючы прыклады і дадатковую інфармацыю пры адказе, разумее асноўныя віды і асаблівасці функцыянавання турыстычнай індустрыі, міжнародныя і нацыянальныя заканадаўчыя акты ў галіне турызма, самастойна і на высокім узроўні выканаў усе віды заданняў па курсу, а таксама актыўна ўдзельнічаў на семінарскіх занятках, карытаўся дадатковымі крыніцамі інфармацыі. |
| 10 (дзесяць) | заслугоўвае студэнт, які поўна, сістэмна і глыбока засвоіў вучэбны матэрыял па праграме, прадэманстраваў грунтоўныя веды і веданне прафесійнага матэрыялу па тэарытычным аспектам турызму, арыентуецца ў дзейнасці міжнародных турыстычных арганізацый, тэндэнцыях развіцця нацыянальнага і міжнароднага турызму, карыстаўся асноўнай і дадатковай літаратурай |

| | |
|---|---|
| | пры выкананні самастойных заданняў, а таксама самастойна, своечасова і высокім узроўні выканаў усе заданні, выдатна рыхтаваўся і бліскуча выступаў на семінарскіх занятках. |

# 5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны

| Нумар раздзела, тэмы | Назвы раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Уводзіны. Прадмет і змест курса | 2 | | | Вуснае апытанне |
| 2 | Асноўныя паняцці. Класіфікацыя турызму | 2 | 1 | | Вуснае апытанне |
| 3 | Культурныя і сацыяльныя аспекты турызму | 2 | | 1 | Вуснае апытанне |
| 4 | Матывацыя ў турызме. Тыпалогія турыстаў | 1 | | 1 | Падрыхт. прэзентацый |
| 5 | Спецыфіка і склад турыстычнай індустрыі | 1 | 1 | | Вуснае апытанне |
| 6 | Экалагічны турызм. Аграэкатурызм | 2 | 2 | | Падрыхт. прэзентацый |
| 7 | Гісторыка-культурны турызм. Круізны турызм | 4 | 4 | | Падрыхт. прэзентацый |
| 8 | Падзейны турызм | 2 | 2 | | Падрыхт. прэзентацый |
| 9 | Рэлігійны турызм | 2 | | 2 | Падрыхт. прэзентацый |
| 10 | Дзелавы турызм | 2 | | 1 | Падрыхт. прэзентацый |
| 11 | Лячэбна-аздараўленчы турызм. Медыцынскі турызм | 2 | | 1 | Падрыхт. прэзентацый |
| 12 | Экстрэмальны, гарналыжны і спартыўны турызм | 2 | 2 | | Падрыхт. прэзентацый |
| 13 | Прамысловы турызм | 2 | | 2 | Падрыхт. прэзентацый |
| 14 | Міжнародныя турыстычныя арганізацыі | 1 | | 2 | Падрыхт. прэзентацый |
| 15 | Інавацыі ў турыстычнай індустрыі | 1 | 1 | | Падрыхт. прэзентацый |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 16 | Турыстычная індустрыя Беларусі | 2 | 1 | | Падрыхт. прэзентацый |
| | Разам | 30 | 14 | 10 | |

## 5.2 Асноўная літаратура

*Асноўная*


1. Веселова, Н. Ю. Организация туристской деятельности : учебное пособие / Наталья Юрьевна Веселова. - Москва : Дашков и К*, 2015. - 254 с.
2. Киреева, Ю. А. Виды туризма : учебное пособие : [16+] / Ю. А. Киреева. – Москва : Директ-Медиа, 2022. – 324 с. : ил., табл. – Режим доступа: по подписке. – URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=686780 (дата обращения: 30.08.2025).
3. Гайдукевич, Л. М.Международное сотрудничество по обеспечению безопасности в туризме : учебно-методическое пособие для студентов учреждений вышего образования по специальности «Международные отношения» / Леонид Михайлович Гайдукевич. - Минск : Четыре четверти, 2022. – С. 72-94.


## 5.3 Дадатковая літаратура


1. Новиков, В. С. Организация туристской деятельности: учебник для студентов учреждений высшего профессионального образования, обучающихся по направлению «Туризм». – Москва: Академия, 2013. – 333 с.
2. Локотко, А. И. Историко-культурные ландшафты Беларуси. – Минск: Белорусская наука, 2006. – 468 с.
3. Малыгина, Н. В. Экологический туризм: учебник для студентов высших учебных заведений, обучающихся по экологическим и туристическим специальностям и направлениям / Н. В. Малыгина. – Москва: Прометей, 2019. – 163 с. –URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=576054 (дата обращения: 26.08.2025).
4. О ведении Единой классификации видов туризма в Республике Беларусь: постановление М-ва спорта и туризма Респ. Беларусь от 7 августа 2023 г. № 36 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – URL: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22340307 (дата обращения: 24.08.2025).
5. О туризме: Закон Респ. Беларусь от 11 ноября 2021 г. № 129-З // pravo.by: Национ. правовой Интернет-портал Республики Беларусь (дата обращения: 24.08.2025).
6. Туризм: словарь / под ред. М. А. Морозова. – Москва : ИНФРА–М, 2020. – 298 с.